ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (2014) ● Чацвер, 15 студзеня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АСНОВА ПОСПЕХУ — ШТОДЗЁННАЯ РАБОТА ● ЖЫЦЦЁ, АДДАДЗЕНАЕ РЭВАЛЮЦЫІ ● АДКАЗНАСЦЬ ЗА ВЯДЗЕННЕ ПАРАЗІТЫЧНАГА СПОСАБУ ЖЫЦЦЯ ● ТЭХНІКА ДАПАМАГАЕ Ў ВУЧОБЕ ● НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ ● ВЫНІКІ — ПА ПРАЦЫ ● СУСТРАКАЙЦЕ, ПОЛЬСКІЯ СЯБРЫ! ● ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ ДАСЛЕДЧЫКА І ПЕДАГОГА ● ГУМАР



*Цікавыя даследаванні ў галіне вывучэння фізіка-хімічных якасцей іенаабменных матэрыялаў, у прыватнасці вывучэнне электраправоднасці катыянітаў у змешаных вадародна-арганічных формах, праводзяцца на кафедры аналітычнай хіміі. Доследы паказалі, што на велічыню свабоднай энергіі абмену арганічных іенаў аказвае рашаючы ўплыў энергія гідрафобнай ўзаемадзейнасці. Разлічаны эфектыўныя гідрафобныя паверхні арганічных іенаў і даследавана цесная сувязь паміж гэтымі велічынямі і тэрмадынамічнымі функцыямі абмену — арганічны іен — іен вадароду.*

*НА ЗДЫМКУ: дацэнт кафедры аналітычнай хіміі Л. М. АЎСЯНКА за працай у лабараторыі.*

# АСНОВА ПОСПЕХУ — ШТОДЗЁННАЯ РАБОТА

Увесь савецкі народ рыхтуецца дастойна сустрэць важнейшую падзею ў жыцці краіны — XXV з'езд КПСС. У канун з'езда па традыцыі падводзяцца вынікі праробленай работы, намячаюцца новыя рубяжы. Падводзіць вынікі выканання рашэнняў XXIV з'езда партыі і вышэйшая школа.

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 ліпеня 1972 года «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» вялікая ўвага ўдзелена завочнаму і вячэрняму навучанню. Далейшага ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці патрабуе і пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя М. Э. Баўмана і Саратаўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Р. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук».

Такая ўвага партыі і ўрада да вячэрняга і завочнага навучання тлумачыцца тым, што гэтыя формы навучання набылі шырокае распаўсюджанне ў краіне, з іх дапамогай падрыхтаваны дзесяткі тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў. Далейшае паляпшэнне завочнай і вячэрняй адукацыі з'яўляецца важнай дзяржаўнай задачай.

Як жа здзяйсняецца гэта задача ў нашым універсітэце?

Без адрыву ад вытворчасці ў БДУ навучаецца 7.575 чалавек, з іх 4.387 — завочнікі, астатнія вучацца на вячэрніх аддзяленнях. 61,2 працэнта студэнтаў-завочнікаў працуюць па выбранай спецыяльнасці, а на некаторых аддзяленнях (правазнаўства, фізіка, хімія, матэматыка) гэты працэнт значна вышэйшы. Разам з тым на аддзяленнях філасофіі, рускай мовы і літаратуры працэнт працуючых па спецыяльнасці раўняецца 40—45. Гэта стварае дадатковыя цяжкасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў, таму што найбольш паспяховым навучанне будзе тады, калі профілі вучобы і работы супадаюць.

Узровень навучання і выхавання студэнтаў залежыць у асноўным ад саставу выкладчыкаў, ад іх навуковай кваліфікацыі, педагагічнага вопыту. Працэс навучання на завочным факультэце здзяйсняюць 450 выкладчыкаў, з іх 32—прафесары, дактары навук, 236—дацэнты, кандыдаты навук, 23—загадчыкі кафедр.

На вячэрніх аддзяленнях працуюць 590 выкладчыкаў, з іх 20—прафесары, дактары навук, 320—дацэнты, кандыдаты навук і 20—загадчыкі кафедр. У апошнія гады пашырылася практыка прыцягнення кваліфікаваных спецыялістаў з прадпрыемстваў і ўстаноў для работы са студэнтамі-завочнікамі і вячэрнікамі.

Пытанні ўдасканалення вучэбна-метадычнай работы з'яўляюцца прадметам пастаяннага вывучэння і абмеркавання на савеце і рэктараце ўніверсітэта, саветах факультэтаў, у партыйных арганізацыях, на паседжаннях кафедр і метадычных камісій. У гэтым навучальным годзе на савеце філфака было абмеркавана пытанне «Аб правядзенні на кафедрах факультэта метадычнай работы па завочнаму і вячэрняму навучанню». Гэта ж пытанне было абмеркавана на саветах юрыдычнага, фізічнага, біялагічнага, гістарычнага і іншых факультэтаў. Большасць кафедр універсітэта пачалі практыкаваць наведванне і ўзаеманаведванне заняткаў выкладчыкамі, праводзіць адкрытыя лекцыі і семінарскія заняткі на завочных і вячэрніх аддзяленнях. Кафедрамі падрыхтаваны вучэбна-метадычныя распрацоўкі, вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў-завочнікаў і вячэрнікаў. Многія кафедры пачалі больш увагі звяртаць на самастойную работу студэнтаў-завоч-

### ІДЗЁМ ДА З'ЕЗДА

нікаў у міжсесійны перыяд і студэнтаў-вячэрнікаў у працэсе вучобы.

Для студэнтаў-завочнікаў шырока практыкуюцца пісьмовыя кансультацыі, індывідуальныя і групавыя кансультацыі ў «дні завочніка». Адной з асноўных форм кіраўніцтва самастойнай работай студэнтаў-завочнікаў, сродкам кантролю засваення імі вучэбнага матэрыялу з'яўляецца рэцэнзіраванне кантрольных і курсавых работ.

Галоўным паказчыкам работы завочнага факультэта, вячэрніх аддзяленняў з'яўляецца паспяховасць студэнтаў. У летнюю экзаменацыйную сесію 1974—1975 навучальнага года яна склала 85 працэнтаў (у зімовую сесію таго ж года — 80 працэнтаў). Па выніках апошняй летняй экзаменацыйнай сесіі студэнты-выдатнікі склалі 2,5 працэнта. Вучылася на «добра» і «выдатна» 25,4 працэнта, 2.586 чалавек атрымалі змешаныя адзнакі, паспяваюць толькі на «здавальняюча» 305 студэнтаў-завочнікаў. Колькасць непаспяваючых склала 15 працэнтаў.

Паспяховасць студэнтаў-вячэрнікаў у летнюю экзаменацыйную сесію мінулага навучальнага года склала 87,6 працэнта.

З прыведзеных даных бачна, што паспяховасць паступова ўзрастае, аднак неабходна ўлічваць не толькі колькасны, а і якасны бок гэтага пытання. За апошнія гады некалькі панізіўся працэнт выдатнікаў і ўзрос працэнт студэнтаў, якія вучацца толькі на «здавальняюча».

У апошні час дэканаты факультэтаў і кафедры некалькі павысілі патрабаванні да якасці вучобы студэнтаў-вячэрнікаў і завочнікаў (гістарычны і геаграфічны факультэты). Аднак дасягнутыя вынікі ў вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай рабоце па падрыхтоўцы спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці яшчэ не адпавядаюць сучасным патрабаванням.

Некаторыя кафедры не ўдзяляюць патрэбнай увагі спецыфіцы навучання на вячэрніх і завочных аддзяленнях, мала практыкуюць правядзенне адкрытых лекцый, практычных і семінарскіх заняткаў, недастаткова здзяйсняюць узаеманаведванне заняткаў выкладчыкамі (кафедры электронных матэматычных машын, радыефізікі і электронікі ЗВЧ).

Маюцца пэўныя недахопы ў рэцэнзіраванні кантрольных і курсавых работ на завочным факультэце. Асобныя рэцэнзіі па свайму зместу абстрактныя і кароткія, па некаторых работах не вытрымліваюцца тэрміны рэцэнзіравання, на радзе кафедр рэцэнзіі абмяркоўваюцца ад выпадку да вып[illegible] На асобных кафед[illegible] не[illegible]мальна адносяцца да зацвярджэння тэматыкі кантрольных і курсавых работ, недастаткова рыхтуюцца і выдаюцца метадычныя распрацоўкі, вучэбныя дапаможнікі і іншая вучэбна-метадычная літаратура.

У планах работ асобных кафедр не знаходзяць адлюстравання вучэбна-метадычная і палітыка-выхаваўчая работа, пытанні навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу і кіравання ім, а таксама прымяненне тэхнічных сродкаў у вучэбным працэсе са студэнтамі-вячэрнікамі і завочнікамі.

Рад кафедр не ўдзяляе належнай увагі павышэнню актыўнасці студэнтаў, не дасягаецца адпаведная рытмічнасць іх работы на працягу ўсяго перыяду навучання, не прад'яўляюцца дастаткова высокія патрабаванні да павышэння якасці іх вучобы і вучэбнай дысцыпліны.

Многія студэнты-вячэрнікі яшчэ часта спазняюцца і без уважлівых прычын прапускаюць вучэбныя заняткі, а дэканаты непатрабавальна адносяцца да гэтых студэнтаў.

На асобных кафедрах недаацэньваюць ролю кіраўніцтва дыпломных работ студэнтаў-вячэрнікаў і завочнікаў, у выніку чаго да кіраўніцтва дыпломнымі работамі дапускаюцца выкладчыкі, якія не маюць дастатковага вопыту для правядзення ўказанай работы (геаграфічны факультэт).

Усе нашы намаганні трэба накіраваць зараз на ліквідаванне адзначаных недахопаў. Партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі, прафесарска-выкладчыцкі састаў павінны прыкласці максімум намаганняў для далейшага ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці.

**У. БАГДАНАЎ,**
**прарэктар БДУ па завочнаму і вячэрняму навучанню**

# ПА БДУ

12 студзеня адбылося паседжанне рэктарата БДУ імя У. І. Леніна. На паседжанні была абмеркавана работа сектара навукова-тэхнічнай інфармацыі і план яго работы на 1976 год. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў загадчык сектара АНТІ С. А. Паваляеў.

Аб выніках работы спартыўна - аздараўленчага лагера БДУ ў 1975 годзе і задачах па арганізацыі адпачынку студэнтаў у 1976 годзе паведамілі рэктарату начальнік лагера А. Г. Кляцкоў і прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце С. А. Ерамееў.

***

На апошнім паседжанні партыйнага камітэта БДУ былі абмеркаваны наступныя пытанні: «Аб кіраўніцтве партыйнага бюро НДІ ПФП сеткай партыйнай асветы», «Аб кіраўніцтве партыйнага бюро біяфака абаронна-масавай работай».

На першаму пытанню выступіў намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце партарганізацыі НДІ ПФП А. А. Андрэнка. Па другому пытанню — асістэнт кафедры сістэматыкі раслін біяфака А. І. Сцефановіч.

Партыйны камітэт прыняў па абмеркаваных пытаннях пастанову.

***

Напярэдадні новага года мясцком БДУ арганізаваў семінар, на якім быў абмеркаван праект ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады».

У актавай зале універсітэта сабраліся старшыні пярвічных прафсаюзных арганізацый, члены прафбюро, студэнты і супрацоўнікі. У дзелавой абстаноўцы прайшло абмеркаванне даклада старшыні універсітэцкай прафсаюзнай арганізацыі І. Г. Родзіна «Аб мерапрыемствах прафсаюзнай арганізацыі БДУ па прапагандзе матэрыялаў снежаньскага (1975) Пленума ЦК КПСС і IV сесіі Вярхоўнага Савета СССР і праекта ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976— 1980 гады».

У спрэчках па дакладу выступілі выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты.

На семінары прысутнічаў старшыня абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў У. П. Кляшняк. Ён выступіў з дакладам «Аб задачах прафарганізацый ВНУ, вынікаючых з рашэнняў снежаньскага (1975) Пленума ЦК КПСС і IV сесіі Вярхоўнага Савета СССР».

У цяперашні час мясцком БДУ працуе над падвядзеннем вынікаў работы калектыву універсітэта ў мінулай пяцігодцы.

***

На факультэтах і ў падраздзяленнях універсітэта праходзяць партыйныя сходы, на якіх камуністы падводзяць вынікі праробленага за дзевятую пяцігодку, намячаюць рубяжы дзесятай. Так, сёння адбыўся партыйны сход фізфака і НДІ ПФП.

На сходзе было разгледжана і ўсебакова абмеркавана пытанне «Стан навуковых даследаванняў на фізфаку і ў НДІ ПФП і іх развіццё ў святле асноўных напрамкаў развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады».

З дакладамі на сходзе выступілі В. В. Ізох і Д. С. Умрэйка.

**Л. АНДРЭЕВА.**

# МАЕ СЕСІІ,

## АБО ЭЛЕГІЧНЫЯ РАЗВАЖАННІ НАКОНТ ЭКЗАМЕНАЎ

Мае сесіі... Летнія і зімовыя, доўгія і кароткія, цяжкія і не вельмі. «Не вельмі» я магу сказаць толькі пасля таго, як экзамен здадзен.

Экзамен...

Калі да яго рыхтуешся, здаецца, — ён самы цяжкі.

Калі на яго ідзеш — уяўляеш сябе поўнай чашай, якую трэба абавязкова данесці.

Калі, нарэшце, прыходзіш — няма мацней жадання хутчэй здаць тое, што прынёс.

Калі ўжо стаіш перад дзвярыма — кожнай клетачкай адчуваеш усю глыбіню бездані паміж табой і тымі шчаслівчыкамі, хто здаў.

Экзамен!

І вось з яго выходзіш. Ціха ідзе снег... Лёгка, спакойна на душы. І да наступнага экзамена далёка. Ён за трыдзевяць зямель. Можна пакатацца на лыжах, можна схадзіць у кіно, можна... А экзамен зноў побач. Вечны, заўсёды хвалюючы і новы.

Экзамены... Іх чарада — сесія. Чарада сесій — курсы, гады. У сесію жывеш лічбамі, а не днямі. І жыццё мераеш не каляндарнымі, а навучальнымі гадамі. Арыфметыка студэнта...

З вышыні сёмай сесіі можна пафіласофстваваць. Ёсць вопыт, ёсць права на параду. Першакурснік, у цябе да экзамена засталося тры дні? Не бядуй, але помні, што гэта тры дні, а не тры дні і чатыры ночы. Ты хочаш зрабіць свой працоўны дзень карацей? Больш прадукцыйна мыслі! Усе роўна дзень вучобы здаецца табе векам? Тады беражыся: груз нязробленага заўтра падвоіцца, паслязаўтра патроіцца. Але ты спакойны. Гэта ўжо няблага. Стрыманасць і спакой — залог не толькі здароўя, але і поспеху, адказу на экзамене, адзнакі. І апошняе: не будзь Рабінзонам на населеным востраве. Свае веды, асабліва калі здаў, перадай сябру.

А я? Я пайду — трэба рыхтавацца да новага экзамена, каб праз два дні прыйсці на яго невялікай энцыклапедыяй з адказамі на ўсе дзевяноста сем пытанняў курса.

**Н. ШАЎЧЭНКА,**
**студэнтка IV курса гістфака.**

# ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ЭКЗАМЕНА

# «АДНОСІНЫ САМЫЯ СУР'ЁЗНЫЯ...»

У 207-й аўдыторыі хімічнага корпуса — два чалавекі: экзаменатар Анатоль Агапеевіч Круглоў і апошні студэнт з ліку трэцякурснікаў 1-й групы хімічнага факультэта, якія здавалі «Асновы навуковага атэізму».

Апошняе пытанне, адказ, кароткі роспіс выкладчыка ў залікоўцы — і студэнт за дзвярыма аўдыторыі. Экзаменатар складае білеты і ведамасці. Адну хвілінaчку, Анатоль Агапаевіч...

**— Які ў Вас настрой пасля экзамена?**

— Вельмі добры. Як аказалася, прадмет мой студэнтам - хімікам спадабаўся. Большасць з іх аднеслася да экзамена сур'ёзна, старанна. Усе адказы—акрамя двух — былі добрыя. Характэрна, што на першую кансультацыю, якая праводзілася па навуковаму атэізму для адної групы, прыйшло паўпатока. І як вынік — добрыя адказы на экзамене. Мне нават цяжка вызначыць тых, хто сёння адказваў лепш за іншых. Мяркуйце самі: з 28 чалавек групы 17 атрымалі «выдатна», 9 — «добра» і толькі 2— «здавальняюча».

Я ўжо прыняў экзамены ў трох групах III курса хімфака. У першай (сёння), пятай і шостай. З дзвюх апошніх выдатнымі адказамі парадавалі Мельнікава, Батый, Жымкова (5 група), Скапцова, Навацкая, Стэфаненка і Крышкевіч (6 група). Ну, а сёння глыбока адказвалі амаль усе.

**— Якія пытанні выклікалі ў студэнтаў цяжкасці ў падрыхтоўцы?**

— Перш за ўсё праца Карла Маркса «Да крытыкі гегелеўскай філасофіі і права. Уводзіны». Адзін са студэнтаў нават прызнаўся сёння: «Чытаў працу тры разы. Затое, калі ў асноўным усё зразумеў, сталі больш лёгкімі іншыя пытанні».

**— Ну, а што расказвалася з задавальненнем?**

— Рэлігійныя напрамкі, іх сутнасць і крытыка. Лёгка і добра разбіралі студэнты працу У. І. Леніна «Сацыялізм і рэлігія».

Гэта сведчанне таго, што атэізм вывучаўся не як дысцыпліна, якую трэба толькі здаць. На адной з кансультацый студэнты выказалі думку аб неабходнасці павелічэння колькасці лекцыйных гадзін па гэтаму курсу. У далейшым мы будзем арганізоўваць у інтэрнаце вечары пытанняў і адказаў па асновах навуковага атэізму.

**— Апошняе пытанне: Вы стаміліся?**

— Не. Калі чуеш добрыя адказы — ніякая стома не бярэ.

**Інтэрв'ю правяла**
**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



**У новым інтэрнаце № 2 на вуліцы Кастрычніцкай на сценах паявіліся маляўнічыя газеты, «Маланкі». З кожным днём паштальён прыносіць сюды усё большую звязку пісьмаў. Вечарамі на лесвічным пралёце ціха гучыць гітара. А ў чытальных залах недзе ўпасці яблыку. Усё гэта сведчыць аб тым, што студэнты паступова абжываюць свой дом, засяленне ў які праходзіла зусім нядаўна.**

**На 13 паверсе, ля самага неба, жывуць біёлагі. Трэцякурснікі Павел Кічкайла і Аляксандр Крысаў толькі што здалі першы экзамен — па псіхалогіі — і з задавальненнем адзначаюць, што ў новым інтэрнаце вучыцца вельмі добра. Іх нават не засмучае лічба «13», што красуецца на дзвярах паверха і дзвярах блока.**

**Ніжэй жывуць хімікі — вясёлы народ. Потым—журналісты, географы... Рэгіну Шырну, студэнтку IV курса геафака, мы сустрэлі на 5-м паверсе. Ёй у новым інтэрнаце падабаецца мноства агульных пакояў: чытальныя залы, ленінскія пакоі, «бытоўкі» і г. д.**

**На першым паверсе — строгі і патрабавальны вахцёр. На здзіўленне, ён ужо ведае ўсіх сваіх жыхароў у твар. Фота В. ДРАЧОВА.**





# ВЫНІКІ—ПА ПРАЦЫ

Самая адказная пара ў жыцці студэнтаў — экзаменацыйная сесія. Асабліва складаная і цяжкая яна для студэнтаў-завочнікаў, якія сустракаюцца са сваімі выкладчыкамі і таварышамі па вучобе толькі адзін-два разы ў год.

На экзаменацыйных сесіях студэнты павінны паказаць, як яны вывучылі і засвоілі важнейшыя палажэнні марксісцка-ленінскай тэорыі і іх ператварэнне ў жыццё нашай партыяй.

У перыяд сесіі кожны студэнт абавязаны ўзяць з сабой пісьмовыя кантрольныя работы з рэцэнзіямі выкладчыкаў. Трэба яшчэ раз нагадаць, што без выканання пісьмовых кантрольных заданняў студэнты-завочнікі не дапускаюцца да здачы экзамена па данай вучэбнай дысцыпліне.

Хацелася б, каб студэнты прыносілі свае канспекты першакрыніц, якія з'яўляюцца наглядным сведчаннем іх добрасумленнай вучэбнай работы. Азнаямленне з канспектамі і пісьмовымі кантрольнымі работамі студэнта дазволіць выкладчыку больш дэталёва высветліць у час прыёму заліку або экзамена прарobленую ім самастойную работу, а разам з гэтым усебакова і аб'ектыўна ацаніць яго веды.

Пры падрыхтоўцы да здачы заліку або экзамена трэба ўлічваць іх асаблівасці. Пры вусным заліку студэнты павінны перш за ўсё паказаць разуменне асноўных пытанняў тэорыі і палітыкі партыі, значэнне гістарычнага вопыту партыі для вырашэння задач сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва.

Залік уяўляе сабой субяседаванне выкладчыка са студэнтам па вывучанаму матэрыялу. Звычайна субяседаванне праводзіцца без папярэдняй падрыхтоўкі студэнтаў у тым сэнсе, што для таго, каб прадумаць адказ на зададзеныя выкладчыкам пытанні, ім не адводзіцца часу, ды і самі пытанні звычайна не складваюцца раней, не друкуюцца ў выглядзе асобных білетаў. Пры прыёме заліку выкладчыкі не толькі выслухоўваюць адказы студэнтаў, але ў ходзе субяседавання выказваюць і свае заўвагі, раяць, што яшчэ трэба прачытаць па данаму пытанню, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, якія прагалы неабходна ліквідаваць, і г. д.

Такім чынам, залік прадугледжвае не толькі праверку атрыманых студэнтам ведаў, але і паглыбленне і расшырэнне іх, удакладненне напрамку і зместу наступнай самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў над вучэбным матэрыялам. Залік уяўляе сабой як бы рэпетыцыю будучага экзамена, які падводзіць вынік усёй работы студэнтаў, высвятляе, наколькі добра і поўна яны вывучылі прадмет.

Калі на заліках студэнты паказваюць свае веды пераважна па вузлавых пытаннях пройдзеных тэм курса, то на экзаменах высвятляюцца іх веды ў поўным аб'ёме вучэбнага матэрыялу.

Самастойная работа немагчыма без дзейснага кантролю. І такім кантролем з'яўляецца экзамен. У адрозненне ад заліку на экзаменах студэнты, як правіла, адказваюць па білетах, раней складзеных і зацверджаных на пасяджэннях кафедр. Калі студэнт упэўнена адказвае на ўсе пытанні экзаменацыйнага білета, з поўным разуменнем раскрывае іх змест, то экзаменатар можа абмежавацца гэтым і, улічыўшы самастойную работу студэнта над пісьмовымі і кантрольнымі работамі, складанне канспектаў першакрыніц і г. д., паставіць адзнаку.

Разам з тым экзаменатар можа задаць студэнту і дадатковыя пытанні, або ўдакладняючыя адказ на пытанні экзаменацыйнага білета, калі апошнія асветлены няпоўна, або ж з мэтай высвятлення ведаў студэнта і па іншых тэмах. Дадатковыя пытанні могуць задавацца і ў тым выпадку, калі студэнт недакладна адказваў па білету, хоць у цэлым паказаў уменне добра разбірацца ў вучэбным матэрыяле. Тут гэтыя пытанні задаюцца з мэтай больш шырокага высвятлення ведаў студэнта і адпаведна больш справядлівай іх ацэнкі.

Такім чынам, экзамен уяўляе сабой вынік усёй самастойнай работы студэнтаў. Каб ён быў найбольш спрыяльным, студэнтам неабходна добрасумленна і ўсебакова падрыхтавацца да экзаменацыйнай сесіі.

Сесія праводзіцца ў вельмі сціслыя тэрміны і спалучаецца з аўдыторнымі заняткамі. Таму кожны студэнт-завочнік павінен з'яўляцца на сесію ўжо добра падрыхтаваным.

Глыбокія веды — залог будучай паспяховай і плённай работы студэнтаў.

**А. ЦАРУК,**
**дацэнт, намеснік дэкана завочнага факультэта.**

# ВУЧОБЕ — КАМСАМОЛЬСКУЮ ГАРАНТЫЮ

*Галоўнае прызначэнне студэнта — вучыцца. Пэўным фактарам тут выступаюць нашы свядомыя адносіны да выканання галоўных абавязкаў перад грамадствам — авалоданне глыбокімі і трывалымі ведамі.*

*Бягучы навучальны год — асаблівы. Разам з усім народам савецкае студэнцтва рыхтуецца дастойна сустрэць XXV з'езд партыі.*

*У сацыялістычным спаборніцтве на лепшую акадэмічную групу па універсітэту першая група IV курса біяфака заняла 2 месца. Большасць студэнтаў факультэта паспяхова спалучае добрую вучобу з камсамольскай і навуковай работай.*

*Ад камсамольскай арганізацыі ў значнай меры залежыць выхаванне ў кожнага студэнта свядомых адносін да вучобы.*

**Н. ГУСАРЭВІЧ.**

# СУСТРАКАЙЦЕ, ПОЛЬСКІЯ СЯБРЫ!

**Народны аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам заслужанага работніка культуры БССР М. А. Лісіцына рыхтуецца па паездкі ў Польскую Народную Рэспубліку. Вось што расказаў мастацкі кіраўнік самадзейнасці універсітэта А. КАСЦЕЦКІ нашаму карэспандэнту:**

— Паездка народнага аркестра народных інструментаў БДУ здзяйсняецца ў парадку культурнага абмену паміж нашым і Ягелонскім універсітэтамі. Па дагаворанасці пачнецца яна 15 лютага. Самадзейныя артысты за дзесяць дзён, праведзеных у Польшчы, дадуць многа канцэртаў беларускай музыкі, пазнаёмяць польскіх сяброў з сучаснымі песнямі і танцамі нашай рэспублікі, агледзяць гістарычныя і культурныя помнікі ПНР.

Да паездкі падрыхтавана новая праграма, ужо зацверджаная мастацкім саветам універсітэта. Сярод трыццаці яе твораў — упершыню ў Беларусі выканаўныя народныя танцы «Лявоніха» і «Бульба» ў сучаснай апрацоўцы, дарагі палякам «Паланез Агінскага», творы беларускіх кампазітараў Семянякі, Глебава, Туранкова і іншых, шэдэўры сусветнай музыкі, класіка.

Дэлегацыю ў Польскую Народную Рэспубліку ўзначаляць члены парткома універсітэта С. А. Лысенка і І. І. Беленькі.

# ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ ДАСЛЕДЧЫКА І ПЕДАГОГА

Мы ўжо прывыклі да таго, што ў Беларусь рэгулярна прыязджаюць вучоныя розных краін, каб не толькі паглыбіць знаёмства з лінгвістычнай літаратурай, якую ствараюць беларускія мовазнаўцы, але і ўстанавіць з імі асабісты кантакт. Сярод тых, з кім асабліва жадаюць абмяняцца думкамі нашы госці,—загадчык кафедры рускай мовы універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар Павел Паўлавіч Шуба.

У гэтыя дні Паўлу Паўлавічу спаўняецца 50 гадоў, і нам, хто працуе побач з ім, вельмі прыемна расказаць з гэтай нагоды грамадскасці універсітэта пра свайго калегу.

Жыццёвы шлях П. П. Шубы—гэта біяграфія таго пакалення, якое актыўную грамадскую дзейнасць пачынала напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, прайшло праз гады ваеннага ліхалецця, абараняла Радзіму ў бітвах з ворагам і ў мірны час памнажае сваёй самаадданай працай яе веліч і поспехі. Нарадзіўся ён у вёсцы Танежыцы на Случчыне—у тым краі, які даў беларускаму народу столькі паэтаў, дзеячаў культуры і навукі. Бацькі яго, сціплыя сельскія працаўнікі, да рэвалюцыі не маглі атрымаць нават пачатковай адукацыі, ім прыйшлося самастойна авалодваць граматай. Яны многа чыталі, палюбілі мастацкае слова і прывілі сыну любоў да кнігі, працавітасць і сур'ёзныя адносіны да справы. Перад самай вайной Павел Паўлавіч паступіў у Слуцкі педтэхнікум, аднак закончыць яго не паспеў: пачалася вайна. А затым—трывожныя дні і ночы ў партызанскай зоне, нарэшце — барацьба з ворагам на I і III Беларускіх франтах. Павел Паўлавіч з гордасцю ўспамінае, што часць, у якой ён служыў, першай уступіла на тэрыторыю ворага ва Усходняй Прусіі, і яму разам з аднапалчанамі была выказана падзяка Галоўнакамандуючым. Ад вайны застаўся ў Паўла Паўлавіча след на ўсё жыццё—і зараз у яго целе сядзяць асколкі ад фашысцкага снарада.

Пасля шпіталю—работа ў вясковай хаце-чытальні і Краснаслабодскім райкоме камсамола, вучоба ў Мінскім педінстытуце і ў аспірантуры, паспяховая абарона ў 1954 годзе кандыдацкай дысертацыі, якую высока ацаніў першы апанент — патрыярх беларускай філалогіі акадэмік К. К. Крапіва. Потым—некалькі год працы ў Інстытуце мовазнаўства АН БССР, а з 1961 года—ва універсітэце, дзе без адрыву ад вучэбных заняткаў у 1971 годзе ён абараніў доктарскую дысертацыю па праблемах беларускага мовазнаўства.

Больш дваццаці гадоў працуе П. П. Шуба на ніве навукі. Спіс яго навуковых прац на сённяшні дзень складаецца больш чым са 100 назваў аб'ёмам каля 300 друкаваных аркушаў. 5 асобных кніг, раздзелы ў калектыўных працах, што ўвайшлі ў залаты фонд беларускага мовазнаўства: акадэмічных граматыках, слоўніках і распрацоўках правапісу. Здзіўляе шырыня навуковых інтарэсаў Паўла Паўлавіча: гэта і даследаванні па сучасных беларускай і рускай мовах, і працы ў галіне агульнага і прыкладнога мовазнаўства. І ва ўсіх іх свой уласны падыход да вывучаемых з'яў, глыбокае пранікненне ў сутнасць, беражлівыя адносіны да фактаў мовы. І заўсёды—імкненне сканцэнтравацца на самых злабадзённых пытаннях мовазнаўства, на тым, што найменш даследавана, але вельмі важна з пункту гледжання лінгвістычнай тэорыі і моўнай практыкі.

Нельга не сказаць добрага слова пра педагагічнае майстэрства Паўла Паўлавіча, яго вялікую грамадскую работу, у якую ўключыўся ён яшчэ ў гады юнацтва і якую праводзіць на філалагічным факультэце як камуніст і выкладчык.

Цяпер Павел Паўлавіч працуе над новым школьным падручнікам рускай мовы.

Глыбокае валоданне матэрыяламі, творчая настойлівасць і працавітасць П. П. Шубы—залог таго, што ён узбагаціць нашу навуку новымі каштоўнымі даследаваннямі. Пажадаем плёну ў яго працы!

Л. ШАКУН.

# ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ



У зімовым парку.
Фота В. Драчова.



Раніца.
Фота А. Басава.

# МЯСЦОВАЯ ХРОНІКА

*Нядаўна радыёфізікам удалося падслухаць і расшыфраваць радыёгутарку з Марса:*

*— Што за рух назіраецца на Зямлі?*

*— А гэта ў ВНУ пачалася сесія.*

***

*Секцыя плавання праводзіць масавы «заплыў» студэнтаў у час экзаменацыйнай сесіі. Удзельнікі, якія змаглі выйсці сухімі з вады, будуць узнагароджаны спецыяльнымі прызамі — стыпендыяй.*

***

*Спробай узяць рэванш за бясслаўна пражыты семестр назваў студэнт юрфака Д. Канавалаў апошнюю ноч перад экзаменам.*

# «ВЕДЫ—СІЛА»

## (ЗАПІСКІ З ДЗЁННІКА)

**1.IX.71. Першы курс:**
Студэнты ведаюць мала, выкладчыкі ведаюць менш, дэканат нічога не ведае...

**1.IX.72. Другі курс:**
Студэнты ведаюць крыху больш, выкладчыкі ведаюць крыху менш, дэканат так нічога і не ведае...

**1.IX.73. Трэці курс:**
Студэнты ўсё ведаюць, выкладчыкі ўсё ведаюць, дэканат ужо нічога не хоча ведаць...

**1.IX.74. Чацвёрты курс:**
Выкладчыкі ўсё яшчэ сумняваюцца, студэнты ужо ўпэўнены, дэканат хоча дазнацца, але цяжка...

**1.IX.75. Пяты курс:**
Усе ведаюць усё аб усіх... Апошні званок: дэканат ведае ўсіх, але ўжо... Усё!

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

**Гэтымі днямі першакурснікі знаёмяцца з сесіяй. Знаёмяцца па-рознаму: хто прыгатаваў да сустрэчы поўныя канспекты, хто — не менш поўныя і дакладныя шпаргалкі. Апошнія яшчэ не ведаюць, што выкарыстаць свае мініяцюрныя «шэдэўры» на экзамене яны так і не змогуць.**

**Сёння спецыяльна для першакурснікаў мы падрыхтавалі**

**ПАРАДЫ**

**Не адпускайце бараду — інакш можа паявіцца «хвост».**

**Прытрымлівайцеся сухога закона — не «плавайце» на экзамене.**

**Смяецца той, хто смяецца пасля сесіі.**

**Адна дрэнная звіліна псуе ўсю галаву.**

**Не ўваходзьце ў навуку з чорнага ходу!**

**Не будзьце сціплымі да нахабства.**

**Не ўсякі, хто паступіў ва універсітэт, паступіў правільна.**

**Адказваючы на пытанні, не гаварыце шэптам. У экзаменатара абмежаванае кола пытанняў, і ваш адказ будзе іншым навукай.**

**Памятай: экзаменатар — дэгустатар ведаў.**

**Запаведзі студэнта: думай коратка, адказвай доўга, у вочы глядзі з разуменнем, пярэч ціха.**









1. Без слоў.

2. Дарога праз экзамен.

3. Без слоў.

# ШАХМАТНЫЯ ДЫЯЛОГІ

*— Хто атакуе, той шукае, — сказаў Чыгорын.*

*— Хто абараняецца, той знаходзіць, — адказаў Стэйніц.*

***

*— Вы перамаглі шахматы! — усклікнуў, звяртаючыся да Філідора, балельшчык.*

*— Хутчэй, шахматы перамаглі мяне, — сумна адказаў музыкант.*

***

*— Калі ваш бацька прайграе, ён вельмі хвалюецца,— сказалі Ганне Комнен.*

*— Калі мой бацька выйграе, ён хвалюецца яшчэ больш, — усміхнулася візантыйская прынцэса.*

***

*— Чаму твой прыдворны паэт карыстаецца ў цябе пашанай больш, чым я?—спытаў у Тамерлана вядомы шахматыст Абд-Алі.*

*— Ты перамагаеш, а ён увенчвае,—адказаў той.*

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 02213 Заказ № 85.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.